**Анатоль Трафімчык**
(Баранавічы)

# Праблема прыналежнасці Берасцейска-Пінскага Палесся (першая палова XX ст.)

Падзеі верасня 1939 г., якія пацягнулі за сабой далучэнне ўсходніх зямель II Рэчы Паспалітай, вынеслі праблему беларуска-ўкраінскай мяжы на Палессі з плоскасці абстрактнай у плоскасць канкрэтную. І хоць па сутнасці такое размежаванне з'яўлялася фармальнасцю — у сілу ўключэння абедзвюх рэспублік у адну дзяржаву, якая кіравалася з Крамля, — адміністрацыйнае дзяленне патрабавала рэальнага ўвасаблення.

Замяшальніцтва, якое ўзнікла спачатку ў новых уладаў, сведчыць пра складанасць станоўчага вырашэння праблемы: на мясцовым узроўні з-за нявызначанасці адміністрацыйнага лёсу паўночна-заходнепалескага рэгіёна часам сустракаюцца дакументы на трох мовах (украінскай, польскай і рускай)[1], а ў беларускай рэспубліканскай газеце была прадубліравана інфармацыя ТАСС пра горад Роўна ў фатаграфічнай рубрыцы „Па гарадах і сёлах Заходняй Беларусі"[2].

У дадзеным артыкуле не ставіцца задача вызначэння найбольш карэктнага правядзення мяжы, каб не ствараць глебы для палітычных спекуляцый, якіх вакол гэтай праблемы занадта. Хочацца прадставіць комплекс некаторых аспектаў разгляду гэтага пытання ды выказацца з такой нагоды.

Першы, да якога звернемся, — лінгвістычны фактар, які вызначаў на працягу дастаткова працяглага часу нацыянальную ідэнтыфікацыю насельніцтва па ўсім усходнееўрапейскім рэгіёне.

Усеагульны перапіс Расійскай Імперыі 1897 г. па Гродзенскай губерні паведамляе пра 22,6% насельніцтва з роднай мовай маларускай (украінскай). Канцэнтрацыя маларосаў назіралася ў трох паветах — Брэсцкім, Кобрынскім і Бельскім (часткова), дзе яны агулам складалі каля 350 тысяч[3].

Крыху пазней Яўхім Карскі практычна толькі на аснове вывучэння беларускіх дыялектаў склаў „Этнографическую карту белорусского племени" (што ўжо само па сабе некарэктна, так як лінгвістычныя даследаванні не ёсць этнаграфічнымі), у якой тэрыторыя з беларускім насельні-

[1] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці, ф. 292, воп. 1, спр. 16, арк. 1, 12, 17.

[2] „Літаратура і мастацтва", 1939, 11 лістапада, с. 3. Праўда, не выключана, што памылка мела карэктарскі характар, пісьменных жа спецыялістаў на той час было недастакова.

[3] *Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897. XI. Гродненская губерния*, Санкт-Петербург 1903, с. 102-103.

цтвам на Берасцейска-Пінскім Палессі была, аднак, значна рэдукавана[4]. Прычыны, думаецца, заключающца ў падыходзе вучонага да праблемы нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Складваецца ўражанне, што Я. Карскі ў разглядаемым рэгіёне вызначаў размежаванне метадам „ад адваротнага”. Гэта значыць, ведаючы асноўныя асаблівасці беларускага „наречия”, ён устанавіў мяжу яго распаўсюджвання. Пры гэтым гаворкі, якія адрозніваліся некаторымі сапраўды прынцыповымі рысамі ад яго, былі аўтаматычна аднесены да бліжэйшага этнасу, у нашым выпадку — украінскага (нягледзячы на таксама прынцыповыя адрозненні і ад асноўнай масы ўкраінскіх гаворак). На гэта працуюць два аргументы.

Першы. Як відаць па карце, распаўсюджванне беларускіх гаворак на ўсходзе Беларусі канстатавалася Я. Карскім як вельмі глыбокае. Справа ў тым, што знаючы дасканала рускую мову, вучоны пры ўсіх цяжкасцях з прычыны роднаснасці выразна адрозніваў яе ад беларускіх дыялектаў (як, дарэчы, і неславянскія прыбалтыйскія гаворкі, няроднасць якіх з беларускімі з'яўлялася відавочнай нават пры няведанні іншых). Да таго ж не факт, што ён асабіста даследаваў Заходняе Палессе, больш бываючы ў паўночна-заходніх і заходніх паветах Беларусі. „Вось чаму трэба лічыць межы беларускага народу, паданыя акадэмікам Карскім у Віленшчыне і на захадзе Горадзеншчыны больш трывалымі, больш угрунтаванымі, чымся паўднёвыя межы Заходняй Беларусі”[5].

Другі. Акадэмік Уладзімір Пічэта звяртаў увагу, што Я. Карскі быў схільны лічыць беларускія дыялекты меней самабытнымі чым украінскія[6], што магло і прадвызначыць у такім дыскусійным моманце перавагу меркаванняў вучонага на карысць большай распаўсюджанасці апошніх. Да таго ж у яго лінгвістычных даследаваннях Палесся Янкам Станкевічам выяўляецца шмат недакладнасцей і памылак[7]. Больш таго, на думку Я. Карскага, „белорусское наречие” было ў свой час „инструментом литературы, которая имела целью возмутить народ против православной церкви и русских”[8], гэта значыць, для такіх меркаван-

[4] Гл.: Е. Ф. Карский, *Этнографическая карта белорусского племени*, [в:] *Труды Комиссии по изучению племенного состава населения России*, вып. 2, Петроград 1918.

[5] Г. Гарэцкі, *Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы (нацыянальны склад насельніцтва Заходняй Беларусі)*, [у:] *Матар'ялы да географіі і статыстыкі Беларусі*, Ін-т беларускай культуры, Аддз. прыроды і нар. гасп-кі; пад рэд. А. Смоліча, Менск 1928, т. 1, с. 8.

[6] *„Нельга кіравацца адным этнаграфічным матэрыялам...”*, „ARCHE-Пачатак”, 2001, № 5, с. 421, 423.

[7] Я. Станкевіч, *Гістарычныя творы*, Мінск 2003, с. 194-196.

[8] Е. Ф. Карский, *Белорусы: 3 т.*, т. 1: *Уступны артыкул М. Г. Булахава, прадмова да першага тома і каметарыі В. М. Курцовай, А. У. Унучака, І. У. Чаквіна*, Мінск 2006, с. 351.

няў у вучонага былі і палітычныя матывы, якія накладалі суб'ектыўны адбітак.

Тым не менш, і Я. Карскі заўважаў, што складзеная ім карта акрэслівае „вобласць, якая хутчэй належыць беларускай *мове*, *чым этнасу*"[9] (курсіў наш — А. Т.), таму гэтыя словы не трэба скідваць з рахунку. Разважаючы аб устаноўленых межах беларускіх гаворак, Я. Карскі робіць некалькі вельмі цікавых заўваг адносна іх. Прынамсі адзначае, што вызначыць дакладна мяжу на беларуска-рускім або беларуска-ўкраінскім сумежжы па сутнасці немагчыма[10]. Гэтым самым нібы перадбачачы эвентуальнасць выкарыстання вынікаў яго даследаванняў, Я. Карскі дэклараваў, што яны не прэтэндуюць на тое, каб легчы ў аснову размежавання этнасаў. Хоць у пэўным сэнсе тут можна адшукаць і супярэчнасці ў пазіцыі самога даследчыка (што ўзнікае, відаць, з прычыны іншых — сацыяльна-палітычных — меркаванняў вучонага, якія, як бачым, такім чынам зашкодзілі метадалагічным асновам навуковых пошукаў). Да таго ж, як указвае Яўген Насытка, галоўны недахоп Я. Карскага (і яго папярэднікаў — Аляксандра Рыціха і Генрыха Наберта) заключаецца „ў тым, што ў этнічным разьмежаваньні народаў іх аўтары кіраваліся толькі фанэтычнымі асаблівасьцямі мовы і не ўлічвалі сукупнасьці лінгвістычных, этнаграфічных і гістарычных фактараў", а таксама ў адсутнасці належнай увагі да даных перапісу 1897 г.[11]

Перапіс 1931 г.[12] II Рэчы Паспалітай па сваёй тэхналогіі блізкі да першага расійскага: 1) яны праводзіліся па моўнай прыкмеце; 2) абедзьве дзяржавы былі зацікаўлены ў асіміляцыі насельніцтва, таму яны не мелі мэты падтасоўваць вынікі на карысць беларускай ці ўкраінскай нацыі за кошт адной з іх (больш таго, палякі, выкарыстаўшы моцныя моўныя адрозненні ды рэдкую для Еўропы XX ст. індыферэнтнасць стасоўна нацыянальнай саматоеснасці, відавочна імкнуліся сфарміраваць з жыхароў Палесся прадстаўнікоў тытульнай нацыі; зрэшты гэтак сама, як і ўкраінскія палітыкі: апошнія — адпаведна — бачылі палескі люд паспаліты ўкраінізаваным). Такім чынам, у Палескім ваяводстве, якое ўключала рэгіёны з кампактным пасяленнем украінцаў, іх было зарэгістравана адно 54 тысячы, а беларусаў таксама ненашмат

[9] Цыт. па: Я. Насытка, *„Тыя ж беларусы..." Этнічныя межы беларусаў у XIX — пачатку XX ст.*, „Беларуская мінуўшчына", 1994, № 4, с. 14.

[10] Е. Ф. Карский, *Белорусы: 3 т.*, т. 1: *Уступны артыкул М. Г. Булахава, прадмова да першага тома і каметарыі В. М. Курцовай, А. У. Унучака, І. У. Чаквіна*, с. 29.

[11] Я. Насытка, *„Тыя ж беларусы..." Этнічныя межы беларусаў у XIX — пачатку XX ст.*, „Беларуская мінуўшчына", 1994, № 4, с. 15; Я. Насытка, *Да этнічнай гісторыі Заходняга Палесься*, „Спадчына", 1995, № 2, с. 154-155.

[12] З-за „выразнай тэндэнцыйнасці" (П. Эбэрхардт) польскі перапіс 1921 г. пакінем без увагі, як і шэраг іншых падобных перапісаў і ацэнак другой паловы XX ст.

больш — 75,4 тысячы. У той жа час 707,1 тысяч складалі так званыя тутэйшыя[13]. Тутэйшы ў літаральным перакладзе — мясцовы. Дарэчы, слова *тутэйшы* старажылы Берасцейска-Пінскага Палесся лічаць польскім словам, якому адпавядаюць мясцовыя *тубылнык, тубылэц* (паведамленне Фёдара Клімчука). У час польскіх перапісаў на Берасцейска-Пінскім Палессі мясцовых жыхароў запісвалі *тутэйшымі*, але гэтае слова не з'яўлялася аўтонімам. Проста маса нацыянальна несвядомых *тутэйшых* з'яўлялася „сырым матэрыялам, прыдатным на ўсякі нацыянальны экспэрымэнт"[14]. На думку Міколы Волаціча, „уведзеная асобная «нацыянальнасць» на Палессі" служыла мэце „штучна паменшыць лік беларусаў"[15]. Да таго ж выглядае зусім незаканамерным і ненатуральным, што на працягу 34 гадоў, за якія многія этнасы якасна эвалюцыянавалі да ўзроўню дакладна акрэсленай нацыі, на Палессі адбываліся адваротныя працэсы (таму, думаецца, хутчэй некаторыя даследчыкі, што лічаць сябе навукоўцамі, не валодаюць элементарнымі здольнасцямі дэдуктыўнай аналітыкі). Тым больш, што нават тыя, хто ў 1897 г. на Берасцейшчыне ідэнтыфікаваўся ўкраінцамі, праз нейкія 15-20 гадоў ужо вызначаліся як беларусы[16].

Спроба такой дысіміляцыі дзеля далейшага апалячвання прывяла адно да таго, што на дадзеную лічбу сталі прэтэндаваць праўкраінскія дэмографы. Па некаторых ацэнках, лічба ўкраінцаў на тэрыторыі Беларусі ў наш час даходзіць да 1 311 тысяч чалавек, а ў 1926-1931 гг. на Берасцейшчыне — амаль да 708 тысяч[17]. Такое супадзенне дае падставы меркаваць, што лічбы так званых тутэйшых тэндэнцыйнымі і (з-за адсутнасці аб'ектыўнай інфармацыі) не толькі тэндэнцыйнымі даследчыкамі ў публіцыстычных і нават навуковых працах нярэдка з дапамогай сафістычнай метадалогіі „расцягваюцца". Так, Ігар Віннічэнка ў адной са сваіх падставовых прац па дадзенай праблеме[18] робіць безапеляцыйную выснову пра этнічную прыналежнасць Берасцейшчыны да ўкраінскіх зямель, у якасці доказаў прыводзячы наступныя асноўныя аргументы:

1. Указвае на даныя расійскага перапісу па трох палескіх паветах з перавагай украінскага насельніцтва, якія дэдуктыўна экстрапаліру-

[13] *Mały rocznik statystyczny. 1939*, Warszawa 1939, s. 22.

[14] Па: М. Волаціч, *Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленне між сучаснай Польшчай і БССР*, [у:] *Беларускі зборнік*, Мюнхен 1956, кн. 4, с. 34-35.

[15] Там жа, с. 6.

[16] Я. Насытка, *Да этнічнай гісторыі Заходняга Палесься*, „Спадчына", 1995, № 2, с. 155.

[17] І. Мельник, *Українці поза межами України*, „Берестейський край", 1997, 16-22 серпня.

[18] І. Винниченко, *Українці Берестейщини, Підляшшя й Холмщини в першій половині XX століття: Хроніка подій*, Київ 1997, 288 с.

юцца вучоным на ўсё Берасцейска-Пінскае Палессе. На яго думку, лічбы гэтага і наступных перапісаў стасоўна ўкраінцаў заніжаны, аднак цвёрдых доказаў не прыводзіцца: маўляў, улічвалі толькі моўны фактар, а не нацыянальную самаідэнтыфікацыю (але даследчык забывае, што жыхары Палесся такой не мелі, што абарочвае словы навукоўца супраць яго ж самога).

2. Указвае на даныя Я. Карскага ды іншых лінгвістаў (пра што ішлося вышэй).

3. Абапіраецца на аналіз этнагенезу (без уліку таго, што нацыянальнасці ў сённяшнім разуменні пачалі фарміравацца ў пачатку XIX ст., а беларуская і таго пазней).

4. Указвае на адміністрацыйна-палітычную канцэпцыю пры правядзенні мяжы ў 1939 г., асуджаючы яе, хоць сам ёю не грэбуе пры разглядзе гісторыі зямель XI-XVIII стст. Да таго ж яму і ў голаў не прыходзіць, што менавіта такая мяжа склалася гістарычна і выкрышталізавалася яшчэ падчас заключэння Люблінскай уніі ў 1569 г., што, паводле Алега Латышонка, з'яўляецца хутчэй за ўсё завяршэннем нейкага этапу падзелу русінаў на беларусаў і ўкраінцаў[19].

Такім чынам, пры аналізе канцэпцыі І. Віннічэнкі яна пачынае праяўляць сваю метадычную неадпаведнасць і неканструктыўнасць. У якасці контраргумента дадамо яшчэ заўвагу Я. Станкевіча пра тое, што аўтонімам „тутэйшыя"[20] называюцца толькі беларусы, чым вызначаецца іх тэрытарыяльная і нацыянальная прыналежнасць[21]. (Варта было б дадаць, што ідзецца пра XX ст., бо стагоддзем раней такая ж з'ява назіралася сярод палякаў. Увогуле, як адзначае Сяргей Токць, „адсутнасць нацыянальнай ідэнтычнасці не была ўласцівай выключна беларускім сялянам. Гэта характэрная рыса традыцыйных сялянскіх супольнасцей у даіндустрыяльную эпоху"[22]. Ва Усходняй Еўропе найглыбей у даіндустрыяльнай эпосе знаходзілася менавіта беларуская нацыя, якая амаль не мела свайго класа буржуа і справядліва з нечай лёгкай рукі стала называцца сялянскай.)

Трацейскія ацэнкі сённяшніх дэмографаў пры аналізе развіцця нацыянальнай самасвядомасці ў разглядаемым рэгіёне першай паловы XX

[19] А. Латышонак, *Напачатку было слова*, [у:] А. Латышонак, *Нацыянальнасьць — Беларус*, Беласток 2009, с. 407.

[20] Патрэбна разумець, аўтонім вар'іраваўся ў залежнасці ад дыялекта, не змяняючы сваёй семантыкі.

[21] Па: М. Зінук, *Беларускае грамадзкае жыцьцё ў Вільні*, „Раніца", 1940, 26 траўня, с. 2. Гл. таксама тоесныя меркаванні Міколы Шкялёнка: М. Шкялёнак, *Беларусь і суседзі. Гістарычныя нарысы*, Беласток 2003, с. 127-133.

[22] С. Токць, *Беларуская ідэнтычнасць у XIX ст.*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2005, nr 24, s. 93-94.

стагоддзя сведчаць „аб эвалюцыі свядомасці і ўсё больш выразнай ідэнтыфікацыі насельніцтва ў бок беларускай, а не ўкраінскай нацый” ужо ў даваенны час[23]. Так, „паводле звестак губернаскага статыстычнага камітэта, у 1910 г. у Кобрынскім павеце ўдзельная вага беларусаў складала 84,8% і паступова павялічылася да 85,7% у 1913 г., а ў Пружанскім — да 87,1%”, і, як лічыць Я. Насытка, ішоў натуральны працэс беларусізацыі паўднёва-заходняга кутка Беларусі[24]. Калі верыць звычайна скрупулёзнаму А. Латышонку, ужо ў 1911 г. амаль усе прызыўнікі з Заходняга Палесся абвяшчалі сябе беларусамі[25].

Беларускі этнас быў палітычна слабейшы за суседнія, таму самаатаясамленне насельніцтва Палесся з беларускім народам параўнаўча вельмі ў малой ступені з’яўляецца ўплывам беларускіх рухаў (калі і быў нейкі палітычны ўплыў, то найбольш з украінскага поўдня ці польскага захаду разглядаемага рэгіёна, не кажучы ўжо пра расійскі фактар). Прабеларускі вектар самавызначэння на дадзенай тэрыторыі аўтахтонны і іманентны.

Што тычыцца асабістых назіранняў і высноў па пытанні прыналежнасці асноўнай масы дыялектаў Берасцейска-Пінскага Палесся (акрамя яго паўднёва-заходняга куточка, дзе, дарэчы, і расійскі перапіс паказаў яго „ўкраінскасць”), дык неабходна прызнаць значныя фанетычныя адрозненні паміж імі і літаратурнай беларускай мовай — паралельна з прызнаннем фанетычных адхіленняў у бок тоеснасці з украінскай мовай. Аднак на лексічным узроўні сітуацыя паўтараецца ў дыяметральна супрацьлеглым парадку: дыялекты схіляюцца да беларускамоўнай лексічнай парадыгмы. Думаецца, што гэтыя дыялекты з’яўляюцца не толькі, а, магчыма, і не столькі пераходнымі паміж украінскімі і беларускімі гаворкамі, а найбольш архаічнай групай усходнеславянскіх дыялектаў — у параўнанні з беларускімі гаворкамі на поўнач ад Палесся і ўкраінскімі на поўдзень. Палессе ж — наогул рэгіён вядомы сваёй архаікай і кансерватыўнасцю вобразу жыцця яго абарыгенаў (гэта адзіная назва рэгіёна, якая мае гістарычную пераемнасць і прысутнічала яшчэ ў сярэднявеччы[26]), таму і мова іхняя, калі можна так сказаць, „адстала” ў сваім развіцці, гэта значыць, змянялася не такімі шпаркімі тэмпамі, як дыялекты ў рэгіёнах у паўночным і паўднёвым напрамку, і да часу стварэння су-

[23] П. Эбэрхардт, *Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі. 1897-1989*, Менск 1997, с. 115.

[24] Я. Насытка, *„Тыя ж беларусы...” Этнічныя межы беларусаў у XIX — пачатку XX ст.*, „Беларуская мінуўшчына”, 1994, № 4, с. 15. Гл. таксама: Я. Насытка, *Да этнічнай гісторыі Заходняга Палесься*, „Спадчына”, 1995, № 2, с. 155.

[25] А. Латышонак, *Мой рэйтынг эўрапейскіх нацыяў на пачатку XXI стагоддзя*, [у:] *Геапалітычнае месца Беларусі ў Эўропе і сьвеце*, пад рэд. В. Булгакава, Варшава 2006, с. 167.

[26] А. Казакевіч, *Палітычная геаграфія Беларусі*, „ARCHE Пачатак”, 2007, № 4, с. 93.

часных літаратурных моў беларускага і ўкраінскага народаў гэта былі ўжо істотныя адрозненні. А імклівае XX стагоддзе ўварвалася і на Палессе, прымусіўшы яго жыхароў паскорыць рух да самавызначэння. І — праявілася „прабеларуская" тэндэнцыя[27], нягледзячы на субтыльнасць беларускіх палітычных сілаў, пра што размова пойдзе ніжэй.

Не абвяргаюць тэндэнцыю самавызначэння ў бок беларускай нацыі і даныя пра прыналежнасць насельніцтва Берасцейшчыны да рэлігійных канфесій. Заўважана, што да XX стагоддзя для ўкраінцаў гістарычна склалася перапляценне ўніяцтва і праваслаўя, беларусам жа да гэтага часу стала характэрна суседства каталіцтва і праваслаўя[28]. Патрэбна разумець суіснаванне двух канфесій для пэўнай нацыі як адзін з важных бакоў яе характарыстыкі. У 1939 г. паляк Францішак Чарвіньскі адзначаў, што сярод украінцаў адсутнічаюць рымакатолікі[29]. Як відаць з даных польскага перапісу 1931 г. уніятаў на заходнепалескай тэрыторыі практычна не назіралася[30] (нават у раёне Брэста — „месцанараджэння" Уніяцкай царквы), тады як крыху на поўдзень, дзе нацыянальная ідэнтыфікацыя ўкраінцаў бясспрэчная, уніяцкая канфесія з'яўлялася дастаткова распаўсюджанай. Праваслаўныя ж, якія самаідэнтыфікаваліся ўкраінцамі, на Берасцейшчыне сапраўды былі ў міжваенны перыяд, пра што сведчыць скліканне ў 1928 г. іх акруговага нацыянальна-царкоўнага з'езду для (нотабена) Брэсцкага, Кобрынскага і Пружанскага паветаў[31], гэта значыць, прыкладна як раз на той тэрыторыі, дзе, паводле Першага расійскага перапісу, і прысутнічалі ўкраінцы ў масавай колькасці. Аднак такую з'яву, як валачобніцтва (карнавальны абход двароў на першы дзень Вялікадня), якое практыкуецца на ўсёй этнічнай прасторы Беларусі і з'ўляецца адным з этнавызначальных крытэрыяў беларусаў[32], у паўднёвых раёнах Брэсцкай вобласці не мае татальнага распаўсюджання[33], ступень і геаграфію якога варта было б дас-

[27] Напрыклад, П. Церашковіч указвае на рашучую арыентацыю інтэлігенцыі Заходняга Палесся на беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, пра што сведчыць і вялікая карэспандэнцыя з гэтага рэгіёна ў „Нашу Ніву" (П. Церашковіч, *Заходнепалескі („яцвяжскі") этнапалітычны феномен (вытокі праблемы)*, [у:] *Беларусіка = Albaruthenica*, кн. 3: *Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне*, рэд. А. Мальдзіс і інш., Мінск 1994, с. 129.

[28] М. Волаціч, *Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленне між сучаснай Польшчай і БССР*, [у:] *Беларускі зборнік*, Мюнхен 1956, кн. 4, с. 11.

[29] J. Tomaszewski, *Ojczyzna nie tylko Polaków. Mniejszości narodowe w Polsce w latach 1918-1939*, Warszawa 1985, s. 44.

[30] *Mały rocznik statystyczny. 1939*, Warszawa 1939, s. 25.

[31] О. В. Власюк, В. Й. Сидорук, В. М. Цятко, *„Східни креси" під знаком польского орла*, Рівне 2004, с. 111.

[32] Л. Салавей, *Валачобнікі*, [у:] *Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік*, рэд. С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш., Мінск 2004, с. 65-66.

[33] У любым выпадку пра гэта сведчаць вусныя паведамленні навуковага супрацоў-

ледчыкам этнаграфіі лакалізаваць канкрэтней. У той жа час украінскі гісторык і этнограф А. Волкаў, лічачы адной з найважнейшых прыкметаў для вызначэння этнічнай прыналежнасці жыхароў Валыні форму надмагілляў і, абапіраючыся на традыцыі мастацка-пластычнага вырашэння надмагілляў, прыйшоў да высновы, што „паўночныя паветы Валыні былі ў мінулым заселеныя беларусамі"[34].

Як бы там ні было, ні лінгвістычная характарыстыка рэгіёна, ні заснаваны на ёй этнаграфічны матэрыял, а таксама рэлігійна-канфесійны фактар па вялікім рахунку не з'яўляліся дамінуючымі ў рашэнні разглядаемай праблемы. Больш таго, апеляванне да падобных аргументаў адбывалася толькі ў кантэксце палітычных дыскусій, нярэдка цяжка адрозных ад спекуляцый. Штуршком для іх з'яўляўся эканамічны фактар. Ці варта казаць, што прыпяцкая водная магістраль, якая паралельна суправаджаецца чыгункай, і багацейшыя лясныя масівы Палесся з'яўляліся апетытным тэрытарыяльным пірагом для любога дзяржаўнага ўтварэння.

Цікава было б зазірнуць у кантэкст генезісу абазначанай праблемы, які або скажаецца, або ўвогуле абмінаецца, і звярнуць увагу на некаторыя важныя, часта вызначальна прынцыповыя моманты. Неабходна адзначыць такі, які ўпускаецца (свядома ці не) многімі (асабліва ўкраінскімі) навукоўцамі. Праблема ідэнтыфікацыі „тутэйшых" на Палессі, якая пачала „прабуджацца" разам з нараджэннем нацыянальных эліт украінцаў і беларусаў, паўстала перш за ўсё не як этнічная, а (геа)палітычная: вастрыню яна набыла толькі ў першай палове XX стагоддзя ў выніку перакройвання межаў, фарміравання (ці спроб фарміравання) новых дзяржаўных утварэнняў, а менавіта — пачынаючы з часу Пер-

ніка Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі дыялектолага кандыдата навук Ф. Д. Клімчука, які нарадзіўся ў Драгічынскім раёне, святара Георгіеўскай царквы вёскі Вялікія Круговічы Ганцавіцкага раёна айца Івана, які нарадзіўся ў вёсцы Рубель Столінскага раёна; у той жа час паведамленне выкладчыка філфака Брэсцкага дзяржуніверсітэта У. У. Барысюка (нарадзіўся ў Маларыцкім раёне) сведчыць пра спарадычную прысутнасць валачобніцтва ў іх рэгіёне, этнічна найбольш украінізаваным — гл., напрыклад, *Первую всеобщую перепись населения Российской империи, 1897. XI. Гродненская губерния*, Санкт-Петербург 1903, с. 102-103 (усе раёны сёння ўваходзяць у склад Брэсцкай вобласці). Праўда, апошняе паведамленне у пэўным сэнсе разыходзіцца са сцвярджэннем С. Парашкова пра найбольшую распаўсюджанасць гэтай з'явы ў паўночнай, усходняй і цэнтральнай частках Беларусі, на Украіне ж яно невядома (С. А. Парашкоў, *Гісторыя культуры Беларусі*, Мінск 2003, с. 59-60).

[34] Цыт. па: М. Раманюк, *Беларускія народныя крыжы. Манаграфія*, Вільня 2000, с. 12, 73. (Першакрыніца: О. К. Волков, *Старинные деревянные церкви на Волыни*, [в:] *Материалы по этнографии России*, т. 1, Санкт-Петербург 1910, с. 37. Дарэчы, варта звярнуць увагу на дату выдання: украінскі даследчык рабіў сваю выснову напярэдадні сацыяльна-палітычных пертурбацый, г.зн. ён не быў імі заангажаваны ў адрозненне ад многіх сваіх паслядоўнікаў.)

шай сусветнай вайны. Падзеі 1914-1921 гг. сталі каталізатарам інтэнсіўнага і тэндэнцыйнага перагляду этнаграфічнага складу ва Усходняй Еўропе і — адпаведна — этнаграфічных мапаў, якія да гэтага адлюстроўвалі „расселение народов достаточно стабильно". „Все заинтересованные страны одновременно обнаружили «несоответствие» этнических границ на всех русских и зарубежных картах (папярэдняга перыяду — А. Т.), как будто бы Белоруссия до этого времени была могущественной империалистической державой, которая несправедливо захватила территории своих соседей и еще оказала влияние в свою пользу на составителей немецких, австрийиских, русских этнографических и лингвистических карт"[35]. Але, як слушна ўказвае Валер Булгакаў, „любой ирредентизм в отношении соседних народов был бессмыслен, ибо перед нацией стоят нерешенные внутренние задачи"[36].

У афіцыйным палітыка-дыпламатычным дыскурсе праблема размежавання беларускага і ўкраінскага этнасаў упершыню была паднята пры фарміраванні мананацыянальных / унітарных дзяржаў на гэтых землях, але не ў якасці мэты, а як сродак, прымяняемы па меры патрэбы. Менавіта з гэтага часу варта весці адлік рэальнай гісторыі беларуска-ўкраінскага размежавання па Берасцейска-Пінскім Палессі.

Фармальна пачатак быў пакладзены, відаць, 1 лютага 1918 г., калі дзяржавы Чацвяртнога саюза (Германія, Аўстра-Венгрыя, Балгарыя, Асманская Імперыя) прызналі незалежнасць Украінскай Народнай Рэспублікі і затым падпісалі з ёй у Брэст-Літоўску мірны дагавор. Па яго ўмовах, паўднёвая частка Беларусі, у тым ліку Берасцейска-Пінскае Палессе, разглядалася як тэрыторыя УНР. Па меркаванні Аляксандра Ціхамірава, Германія з саюзнікамі ў выглядзе фармальна незалежнай Украіны бачыла багатую на паліва і сыравіну базу[37], таму прырэзванне эканамічна выгадных надзелаў да УНР не з'яўляецца нонсенсам.

Брэсцкі мірны дагавор ад 3 сакавіка 1918 г. фактычна замацаваў за Украінай, у абліччы якой Захад бачыў рэальнага дзейнага ворага бальшавіцкай Расіі, нібыта res nullius, „бясхозную" палескую тэрыторыю[38],

[35] Е. Ширяев, *Белорусы: история и территория*, „Неман", 1991, № 7, с. 156-157.

[36] В. Булгаков, *История белорусского национализма*, Вильнюс 2006, с. 211.

[37] А. В. Ціхаміраў, *Праблемы беларуска-ўкраінскіх адносін у 1918-1920 гг.*, [у:] *Беларусь — Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18-19 сакавіка 2003 г.)*, рэдкал.: У. І. Навіцкі (гал. рэд.), М. П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш., Мінск 2004, с. 214.

[38] Нічыім — у нацыянальным аспекце — разглядалі Палеессе затым і кіраўнікі ІІ Рэчы Паспалітай. Так, ваявода Палескага ваяводства С. Даўнаровіч прапанаваў праект, у якім Палессе выступала своеасаблівым ключом да паланізацыі ўсіх „усходніх крэсаў" (Я. Міранoвіч, *Беларускі і ўкраінскі кантэкст у палескім праекце ваяводы Станіслава Даўнаровіча*, [у:] *Беларусь — Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18-19 сакаві-*

права на якую ўкраінская дэлегацыя дабілася ў ходзе перамоваў з так званымі Цэнтральнымі Сіламі. Хоць раней адзін з прадстаўнікоў германскай дэлегацыі генерал Макс Гофман заяўляў, што бясспрэчна ўкраінскай тэрыторыяй для яго з'яўляюцца землі на поўдзень ад Брэста на ўсходні бок Буга і на ўсход ад Брэста па чыгунцы Брэст — Пінск на поўдзень ад яе. А калі ўкраінскія дыпламаты ўказалі таксама на нібыта ўкраінскія землі Мінскай і Гродзенскай губерняў, якія ляжалі на поўнач ад Брэста, то Гофман адпрэчыў: маўляў, падчас палявання на поўнач ад чыгункі ўкраінцаў не сустракаў, дый палонныя таксама казалі яму, што ўкраінцаў там няма[39].

Відавочна, што і Германіі, і інтэнсіўна адраджаемай Польшчы, дый краінам Антанты было б выгадна мець „санітарны" бар'ер ад Савецкай Расіі, як і апошняй ад Захаду: крыху на поўнач ад Брэста і Пружанаў праводзілася літоўска-ўкраінская мяжа працягласцю з захаду на ўсход больш за сто кіламетраў (гл. дадатак № 1)[40]. Сілы беларускага адраджэння на той гістарычны момант не маглі супрацьстаяць тым працэсам па аб'ектыўных прычынах: разгром бальшавікамі ў канцы 1917 г. Усебеларускага Кангрэса стварыў сітуацыю, у якой нацыянальныя сілы Літвы і Украіны, падтрыманыя немцамі, апынуліся ў больш авантажным становішчы, што прымусіла звярнуць увагу ваюючых бакоў на праблему самавызначэння гэтых усходнееўрапейскіх народаў. Пытанне ж пра беларускую дзяржаўнасць, як і спроба яе юрыдычнай рэалізацыі Устаўнымі граматамі 9 і 25 сакавіка 1918 г., у плоскасці гістарычна-палітычнай рэальнасці, практычнага ўвасаблення[41] стала „раскручвацца", лабіравацца некалькі пазней, чым паўночнага і паўднёвага суседзяў, аднак таго часавага адрэзка было дастаткова, каб гэтае пытанне аказалася лішнім для ўсіх, акрамя саміх беларускіх адраджэнцаў, так як да гэтага быў заключаны шэраг міжнародных дагавораў, якія не прадугледжвалі наяўнасці беларускага боку. (І гэта на фоне та-

*ка 2003 г.)*, с. 265-268). Такім чынам, нацыянальна невыразнае Палессе ў той час з'яўлялася важным фактарам для маніпуляцый у асабістых інтарэсах розных бакоў.

[39] І. Л. Гошуляк, *Питання соборності українських земель на Брест-Литовскій мирній конференції*, „Український історичний журнал", 2004, № 2, с. 21.

[40] Ю. Лоза, *Західне Полісся: етнічні межи і політичні кордони*, „Пам'ятки України: історія та культура", 2002, № 3-4, с. 22. На такую мяжу дазволілі разлічваць літоўцам і ўкраінцам немцы, якія на той час былі фактычна гаспадарамі беларускай тэрыторыі, тым больш што ствараемыя дзяржавы Літвы і Украіны знаходзіліся б у вялікай ступені залежнасці ад Германіі.

[41] На тэарэтычным узроўні варыянты развіцця самастойнай Беларусі (у тым ліку і ў канфедэратыўным саюзе з Літвой) распрацоўваліся ад пачатку першай сусветнай вайны (гл., напрыклад: А. Грыцкевіч, *Беларуска-літоўскія дачыненьні: 1918-1922 гг.*, „Спадчына", 1994, № 5, с. 58-60).

Территория Социалистической Белоруссии
(ССРБ)

1-2 января 1919 г.




решение ЦК РКП(б) от 16 января 1919 г.
и юридическая дата - 2 февраля 1919 г.




Илл. к тексту

гачаснага стварэння контураў новага палітычнага ўладкавання ў Еўропе, што мела ў аснове перш за ўсё нацыянальны прынцып, які, насамрэч, як указала Лідзія Мілякова, з’яўляўся амбівалентным[42].)

26 сакавіка 1918 г. беларуская дэлегацыя на чале з Александрам Цвікевічам выязджае ў Кіеў. 10 красавіка яна звяртаецца да кіраўніцтва УНР з прапановай стварыць сумесную камісію па пытанні размежавання іх краін. Украінцы адказалі, што з іх боку такая камісія ўжо створана і ўспрынялі прапанову беларусаў як імкненне перагледзець некаторыя артыкулы Брэсцкага мірнага дагавору[43]. Тым не менш перамовы на гэты конт пачаліся.

Кіраўніцтвам БНР і УНР была ўскосна пацверджана перавага стратэгічных матываў над этнічнымі на сустрэчы [беларускай — А. Т.] дэлегацыі з Міхаілам Грушэўскім, дзе былі выказаны планы прадастаўлення беларусам нацыянальна-персанальнай аўтаноміі і стварэння з Гомельскага, Мазырскага і Рэчыцкага паветаў „беларускага П’емонта”, г.зн. культурна-нацыянальнага самакіравання ва ўсходняй частцы Палесся, што для дэлегацыі БНР не з’яўлялася прымальным[44]. Пэўную слушнасць той пазіцыі пацвердзіла практыка міжнародных стасункаў беларускіх суседзяў, якая паказала, што прадукуючы ў далейшым ідэі так званага беларускага П’емонта і Літва, і Польшча кіраваліся ў тых варунках чыста меркантыльнымі меркаваннямі, разлічанымі толькі на пашырэнне сваёй тэрыторыі і на асабістае дзяржаўнае ўзмацненне без шчырага клопату пра беларускае адраджэнне.

Аднак з боку прадстаўнікоў БНР мелі месца прапановы кансенсусу, умовы якога заключаліся ў дапамозе ўкраінскага ўрада пры ўстанаўленні мяжы паміж Беларуссю ды Расіяй, што мела б на ўвазе меншую

[42] Л. Б. Милякова, *Польша на пути к моноэтническому государству (1918-1947 гг.)*, http://www.history.machaon.ru/all/number_13/analit4/milyakova/index.html

[43] Па: А. Кукса, *Белорусско-украинские дипломатические контакты (январь — декабрь 1918 г.)*, „Журнал международного права и международных отношений”, 2006, № 1, (http://www.evolutio.info/index.php?option=com_contenttask=view;id=985Itemid=215).

[44] В. Лебедзева, *БНР — УНР: першы вопыт дзяржаўных стасункаў (вясна 1918 г.)*, „ARCHE-Пачатак”, 2001, № 5, с. 398. Спачатку ж абедзьве дэлегацыі сышліся на тым, каб прыняць за аснову этнаграфічны прынцып, але ў цеснай сувязі з эканамічным і геаграфічным. Прычым беларуская дэлегацыя выказала меркаванне, што будзе кіравацца ў якасці асноўнай картай Я. Карскага. І тут нельга не пагадзіцца з крытыкай украінскіх даследчыкаў далейшых прэтэнзій БНР на Берасцейшчыну, бо яе большая частка, паводле Карскага, не ўключалася ў межы „беларускага племені”. Аднак, улічваючы недахопы навуковай пазіцыі аўтара карты (гл. вышэй) і агульны кантэкст перагавораў (украінцы таксама адыходзілі ад мяжы, вызначанай Я. Карскім, на сваю карысць), дзеянні беларускай дэлегацыі нельга назваць алагічнымі як з дыпламатычнага гледзішча, так і ў шэрагу іншых аспектаў: этнаграфічным, эканамічным, геаграфічыным etc.

прынцыповасць з боку беларускіх дыпламатаў стасоўна правядзення паўднёвай мяжы[45]. Гэта значыць, перамовы набывалі характар дыпламатычных гульняў, якія выходзілі за рамкі нібыта толькі двухбаковай праблемы з яе ўнутранымі мэтамі і сродкамі (вядома, што некалькі пазней просьба пра падтрымку БНР у спрэчцы аб межах з Украінай паступала, але не афіцыйна, а ў прыватанай гутарцы, і расійскім дыпламатам[46].) Мэтай дыпламатычных хітрыкаў, выпрацаваных уключаным у склад беларускай дэлегацыі Мітрафанам Доўнар-Запольскім, было „перавядзенне перамоваў з двухбаковага на шырокі міжнародны ўзровень”, тым больш што прадстаўнікі БНР не мелі паўнамоцтваў прымаць рашэнні аб устанаўленні дзяржаўных межаў[47]. Дадзены выпадак з’яўляецца тыповым для кантэксту Першай сусветнай вайны, калі „многія ненацыяналістычныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя супярэчанні набывалі этнічнае і нацыянальнае адценне”[48].

Ключ да вытлумачэння тагачаснай украінскай пазіцыі адшукваецца ў першакрыніцах — пратаколах беларуска-ўкраінскіх перагавораў, падчас якіх старшыня дэлегацыі УНР Анастасій Ліхнякевіч патлумачыў прычыну катэгарычных інтэнцый максімальна паўночнага правядзення мяжы Украіны па Берасцейска-Пінскім Палессі: „Лінія чыгункі Пінск — Гомель можа быць украінскай — гэта з пункту погляду геаграфічнага. Вядомая кожнаму рэч, што ні Польшча, ні Маскоўшчына ніколі не зракуцца сваёй імперыялістычнай экспансіі на Беларусь. Калі б Украіна ведала, што яе суседам навечна будзе Беларусь, мы, можа, сказалі б нешта іншае”[49]. Хацелася б, каб падкрэсленыя ў цытаце намі (А. Т.) словы былі пачуты праз гады сённяшнімі ўкраінскімі даследчыкамі разглядаемай праблемы.

Вынікам стасункаў паміж БНР і УНР у праблеме размежавання стаў прапанаваны 28 красавіка 1918 г. беларускай дэлегацыяй праект прэлімінарнага дагавора, паводле якога ўкраінская дэлегацыя на перамовах у Курску падтрымала б прадстаўнікоў БНР у справе прызнання рэспублікі і ўстанаўлення беларуска-расійскай мяжы ўзамен за тэрытарыяль-

[45] Гл.: *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 1, Вільня — Нью-Ёрк — Менск — Прага 1998, с. 108-113; А. В. Ціхаміраў, *Станаўленне і развіццё беларуска-ўкраінскіх адносін ў 1917-1920 гг.*, http://lib.world-mobile.net/belarus/wmobile_readme.php?subaction=showfull;id=1141337326;archive=;start_from=;ucat=8;.

[46] В. Мазец, *Межы БНР*, „Спадчына”, 1993, № 2, с. 107.

[47] В. Лебедзева, *Пратаколы беларуска-ўкраінскіх перамоваў аб мяжы. Кіеў, красавік 1918 года*, „Архівы і справаводства”, 2000, № 5, с. 94.

[48] Цыт па: В. Верстюк, *Чи на війні як на війні?*, „Український гуманітарний огляд”, 2000, випуск 4, с. 62.

[49] Па: В. Лебедзева, *Пратаколы беларуска-ўкраінскіх перамоваў аб мяжы. Кіеў, красавік 1918 года*, „Архівы і справаводства”, 2000, № 5, с. 94.

ныя саступкі. Беларуска-ўкраінскую мяжу, паводле праекта, павінны былі б устанавіць праз месяц па заключэнні міру паміж УНР і Савецкай Расіяй[50].

Дзяржаўны пераварот на Украіне ўнёс прыкметныя змены ў працэс беларуска-ўкраінскіх перамоваў. Дыпламатыя Украінскай Дзяржавы праблему сваёй мяжы на Палессі пачала рашаць на перамовах з РСФСР (май — кастрычнік 1918 г.). Гэты працэс адбываўся дастаткова амбівалентна. З аднаго боку ўкраінскія дыпламаты заявілі, „што паколькі Беларусь (...) стала на шлях дзяржаўнага самавызначэння і аддзялення ад РСФСР, дык устанаўленне дзяржаўных межаў паміж імі (...) павінна было вырашацца (...) без якога-небудзь дыктату з боку РСФСР”[51]. Аднак з іншага боку заяўлялася, што перамовы пра беларуска-ўкраінскую мяжу будуць весціся з расійскай дэлегацыяй — да таго часу, пакуль Беларусь не стане суверэннай дзяржавай і суседкай Украіны[52]. Расійская ж дэлегацыя патрабавала ад украінскай „згадзіцца з тым (...) што мы (бальшавікі — А. Т.) маем уладу (...) на Беларусі”[53]. І гэта адбывалася ў той час, калі БНР яшчэ існавала не толькі дэ-юрэ, але і ажыццяўляла практычную дзяржаўную дзейнасць[54]. Гэта значыць, пры жаданні ўрад Украінскай Дзяржавы меў магчымасць весці перамовы з прадстаўнікамі БНР (як і рабілася ў часы ўрада М. Грушэўскага), а словы расійскіх дыпламатаў на той момант не адпавядалі рэчаіснасці, бо практычна ўся Беларусь тады знаходзілася пад акупацыяй нямецкай арміі (праўда, кіраўніцтва Германіі, маючы на той момант фактычную ўладу над большай часткай беларускіх зямель, згодна з „Руска-Германскім дадатковым дагаворам” ад 27 жніўня 1918 г. прызнавала права РСФСР на гэту тэрыторыю, збіраючыся ачысціць яе „паралельна наяў-

[50] Па: А. Кукса, *Белорусско-украинские дипломатические контакты (январь — декабрь 1918 г.)*, „Журнал международного права и международных отношений”, 2006, № 1, (http://www.evolutio.info/index.php?option=com_content;task=view;id=985;Itemid=215 )

[51] *Мирні переговоры між Українською Державою та РСФСР 1918 р. Протоколи і стенограми пленарних засідань*, Київ — Нью-Йорк — Филадельфія 1999, с. 17.

[52] Там жа, с. 231.

[53] Там жа, с. 228.

[54] Паводле міжнароднага права, „государство продолжает существовать в смысле международного права даже тогда, когда оно *временно* не обладает центральной властью, поскольку оно представляемо не только своим центральным правительством, но и *всеми* его органами. (...) Даже захват противником всей его территории („debellation”) сам по себе не прекращает существования побежденного государства (...)” (па: С. З. Случ, *Советско-германские отношения в сентябре-декабре 1939 года и вопрос о вступлении СССР во Вторую мировую войну*, „Отечественная история”, 2000, № 5, с. 46-58; № 6, с. 10-27 (узята з Інтэрнэта: http://sscadm.nsu.ru/deps/hum/kirillov/ref-liter/slutch-00.html).

ным узносам"[55]). Магчыма, украінскі ўрад не ішоў на перамовы аб мяжы з дыпламатамі БНР па той прычыне, што стала б відавочным яго неадпаведнасць дэкларуемых прынцыпаў і намераў па пытанні межаў і рэальных памкненняў: кіраваліся нібыта этнічна-тэрытарыяльным прынцыпам на аснове даных перапісу 1897 г.[56], а насамрэч межы праводзілі багата паўночней[57]. (У той жа час прамільгнула ідэя беларуска-ўкраінскай федэрацыі[58].) Такім чынам, перамовы выявілі сапраўдныя інтэнцыі абодвух бакоў, а менавіта — пашырэнне тэрыторыі сваёй дзяржавы за кошт магчымай прасторы, у дадзеным выпадку дзяльбе падвергся „палескі пірог".

Увогуле з боку Антона Луцкевіча ў яго бытнасць прэм'ер-міністрам БНР паралельна з дамаганнямі юрыдычнага прызнання Беларусі ў якасці незалежнай дзяржавы і вяртання беларускіх палескіх паветаў зыходзілі прароцкія папярэджанні, „што запозненае прызнанне Беларускай Народнай Рэспублікі можа прывесці да негатыўных вынікаў". Ён, як заўважае Анатоль Сідарэвіч, не памыліўся: бальшавікі расправіліся і з БНР, і з УНР паасобку. Па меркаванні гісторыка, украінскае кіраўніцтва не хацела развітвацца з палескімі землямі, таму адцягвала юрыдычнае прызнанне БНР, хаця, як вынікае з накідаў мемарандума ўкраінскаму ўраду аўтарства А. Луцкевіча, беларускай дэлегацыі было заяўлена, што ўкраінскі ўрад пойдзе насустрач жаданням Беларусі ў справе звароту занятых украінцамі паўднёвых беларускіх паветаў ды іншых пытанняў[59].

Пад ціскам такіх гістарычных акалічнасцей навукоўцы і тым больш грамадскія дзеячы воленс-ноленс палітызаваліся, што абумоўлівала іх тэндэнцыйнасць у выніках. Аднак сягоння відавочна тое, што з усіх бакоў, якія былі зацікаўлены ў тым, каб „знайсці" на Палессі чым больш сваіх суплеменнікаў, самую слабую палітычную сілу, амаль неканкурэнтаздольную — па прычыне розных палітычных абставінаў — мелі беларусы, што дазволіла суседзям маніпуляваць масамі насельніцтва ў сваіх мэтах. Менавіта такія маніпуляцыі, у ходзе якіх і па сён-

[55] *Русско-Германский добавочный договор к мирному договору между Россией, с одной стороны, и Германией, Австро-Венгрией, Болгарией и Турцией — с другой*, „Спадчына", 1993, № 3, с. 77.

[56] *Мирні переговоры між Українською Державою та РСФСР 1918 р. Протоколи і стенограми пленарних засідань*, с. 351.

[57] Там жа, с. 342.

[58] Гл.: А. В. Ціхаміраў, *Станаўленне і развіццё беларуска-ўкраінскіх адносін ў 1917-1920 гг.*, http://lib.world-mobile.net/belarus/wmobile_readme.php?subaction=showfull;id=1141337326;archive=;start_from=;ucat=8;.

[59] А. Сідарэвіч, *Старонкі з гісторыі БНР*, [у:] *Арадженне: Гістарычны альманах*, вып. 1, склад. і навук. рэд. А. П. Грыцкевіч, Мінск 1995, с. 225; *Мемарандум украінскаму Ураду*, [у:] *Арадженне: Гістарычны альманах*, вып. 1, с. 229-230.

няшні дзень кропкі над „і” не расстаўлены, наводзяць на думку пра прэваліраванне ў Палескім рэгіёне беларускага нацыянальнага элемента, ва ўсялякім выпадку сярод той, зусім немалой часткі насельніцтва, якая дала глебу для такіх маніпуляцый[60].

Дарэчы, у выпадку незацікаўленасці палітычных рухаў па праблеме прыналежнасці Берасцейска-Пінскага Палесся, як гэта было ў міжваеннай Польшчы, да яе падыходзілі талерантна і памяркоўна абодва бакі[61], аднак, як паказвае досвед усёй гісторыі, у першую чаргу звяртаюць на сябе ўвагу канфлікты і звадкі, некаторымі забываецца, што адсутнасць падзей падобнага кшталту з'яўляецца не менш важнай падзеяй у гістарычным развіцці, якая нярэдка характарызуе сутнасць палітычных спрэчак. У дадзеным выпадку пасля брутальнага Рыжскага дагавора праблема правядзення па Палессі адміністрацыйнага дзялення з гледзішча этнічнай адпаведнасці стала, як і за Расійскай Імперыяй, зноў неактуальнай, бо ў нацыянальным супрацьстаянні ў беларусаў і ўкраінцаў з'явіўся агульны праціўнік у аблічччы польскага шавінізму. Гэты факт раскрывае прэтэнцыёзную надуманасць палітычных спрэчак пра прыналежнасць Берасцейска-Пінскага Палесся, бо ў выпадку натуральнага, а не надуманага існавання такой праблемы яна заставалася б у спектры асноўных нацыянальных пытанняў.

Восенню 1939 г. разглядаемая праблема зноў запатрабавала вырашэння: пасля далучэння ўсходніх правінцый ІІ Рэчы Паспалітай неабходна было размеркаваць Берасцейска-Пінскае Палессе паміж Украінай і Беларуссю — фармальна незалежнымі рэспублікамі (у 1919-1921 гг. ва ўмовах выжывання савецкай улады праблема беларуска-ўкраінскага размежавання ў гэтым рэгіёне не ўяўлялася істотнай, а пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора — практычна неактуальнай; між іншым тагачасныя спробы вырашэння той праблемы пакідалі рэгіён Беларусі).

Вырашальным аргументам, па прызнанні Мікіты Хрушчова, тагачаснага сакратара ЦК КПУ, паслужыла партыйнае размежаванне ў польскі перыяд. Яно ж было абавязана выпадковай акалічнасці: мясцовым падпольшчыкам было непараўнаўча складаней падтрымліваць сувязь

[60] Аналагічную сітуацыю можна назіраць на Віленшчыне, хоць яна на фоне „забітага” Палесся выгадным чынам вылучаецца ў сэнсе ўзроўню і адукацыі, і нацыянальнай свядомасці: А. Трафімчык, *Зводная табліца дэмаграфічных ацэнак Віленшчыны першай паловы XX стагоддзя: нацыянальны аспект (лакалізацыя вакол тэрыторый, якія адышлі Літве ў 1939 і 1940 гг.)*, http://www.radzima.org/pub/artykul.php?sn=4; ці: А. Трафімчык, *Зводная табліца дэмаграфічных ацэнак Віленшчыны першай паловы XX стагоддзя: нацыянальны аспект (лакалізацыя вакол тэрыторый, якія адышлі Літве ў 1939 і 1940 гг.)*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne”, Białystok 2004, nr 22, s. 173-182.

з цэнтрам у Львове, чым мець яе з такім жа цэнтрам у Вільні і Беластоку[62]. Прычыны такой сітуацыі не вытлумачваюцца. А ў іх, можа быць, уся справа: гэта даказвае геапалітычную арыентацыю Берасцейска-Пінскага Палесся на поўнач, а не на поўдзень, бо камунікацыйныя сувязі звычайна з'яўляюцца адно вынікам, наступствам сацыяльна-эканамічных і палітычных сувязей. Разам з тым трэба адзначыць, што Камень-Кашырскі павет, які потым адышоў УССР, быў зонай дзеяння КПЗУ — у адрозненне ад астатняй тэрыторыі Палескага ваяводства, падлеглай „юрысдыкцыі" КПЗБ[63]. Гэта сведчыць пра тое, што камуністычным кіраўніцтвам у Маскве загадзя праграмаваўся падзел на Заходнім Палессі між Украінай і Беларуссю. Па ўспамінах жа Панцеляймона Панамарэнкі, калі абмяркоўвалі ў Крамлі правядзенне мяжы па Палессі, Мікіта Хрушчоў прызнаваўся, што хацеў набыць для Украіны багатую на лясы тэрыторыю, на што Іосіф Сталін выдзеліў Украіне ўчастак з ляснымі масівамі (пэўна, маецца на ўвазе Камень-Кашырскі павет — А. Т.), чым і быў дасягнуты кансенсус[64]. Адпаведнага зместу дакладную кіраўнік БССР накіраваў пры вырашэнні пытання аб размежаванні І. Сталіну. У дакуменце П. Панамарэнка прывёў глыбокі навуковы ана-

[61] Гл.: Э. Мазько, *Палессе ў канцэпцыях беларускіх палітычных партый Заходняй Беларусі*, [у:] *Загароддзе-3: Матэрыялы навук.-краязнаўч. канф. „Палессе ў XX стагоддзі", 1-4 чэрвеня 2000 г., Беласток*, уклад., агул. рэд. Ф. Д. Клімчука, А. Энгелькінг, В. А. Лабачэўскай, Мінск 2001, с. 150; А. М. Вабішчэвіч, *Украінская прысутнасць у грамадска-палітычным і культурна-асветніцкім жыцці заходнебеларускіх земель (1920-30-я гг.)*, [у:] *Беларусь — Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18-19 сакавіка 2003 г.)*, рэдкал.: У. І. Навіцкі (гал. рэд.), М. П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш., Мінск 2004, с. 248; А. В. Пашкевіч, *Беларуска-ўкраінскае ўзаемадзеянне пад час выбарчых кампаніяў і ў парламенце II Рэчы Паспалітай*, [у:] *Беларусь — Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18-19 сакавіка 2003 г.)*, с. 269-271; О. В. Власюк, В. Й. Сидорук, В. М. Цятко, *„Східни креси" під знаком польского орла*, с. 22, 45, 85-86 и др.; Ю. Гаврилюк, *Берестейщина — регіон у лабетах геополітики*, „Пам'ятки України: історія та культура", 2002, № 3-4, с. 76. Праўда, у апошнім выпадку прыведзены таксама прыклад і нязгоды насельніцтва Берасцейшчыны з прычыны распаўсюджвання назвы „Заходняя Беларусь" на Берасцейшчыну (1926 г.), аднак цяжка паверыць у „самасційнасць" такога кроку ў цэлым інертнага насельніцтва Палесся, наўрад ці тут абышлося без інспіравання. У планах Варшавы была асіміляцыя нацыянальна безаблічнага палескага краю з мэтай убіць клін паміж беларускім і ўкраінскім этнасамі, што ізноў-такі ўказвае на іх унію ў барацьбе супраць польскага шавінізму.

[62] Па: А. Мартынов, *Разукраинизация*, „Берестейський край", 1997, 26 квітня — 2 травня.

[63] W. Śleszyński, *Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej*, Warszawa 2007, s. 288.

[64] П. К. Пономаренко, *События моей жизни*, „Неман", 1992, № 3, с. 156-158.

ліз, відавочна, падрыхтаваны навукоўцамі, аргументавана раскрывакаваўшы пазіцыю Я. Карскага па гэтам пытанні і вылучыўшы свае доказы, заснаваныя на гістарычным матэрыяле і даных перапісаў[65].

У далейшым насельніцтва, якое размаўляла на дыялекце, набліжаным фанетычна больш да ўкраінскай мовы, чым да беларускай, што адзначаюць многія мовазнаўцы на працягу ўсёй гісторыі даследавання праблем Палесся[66], у „паспортах СССР записывалось преимущественно белорусами либо русскими"[67], што істотна паменшыла лік украінцаў у рэгіёне. Наўрад ці пры гэтым улада Саветаў „падыгрывала" інтарэсам беларускай рэспублікі ва ўмацаванні непарушнасці яе межаў. Хутчэй ставілася мэта ліквідаваць нацыянальную гетэрагеннасць на шляху яе трансфармацыі ў савецкую гамагеннасць этнасаў, што мела на ўвазе пазбаўленне этнакультурнай тоеснасці не толькі ўкраінскай, але і беларускай нацыі. Гэта значыць, калі на першы раз змяненне нацыянальнасці можна разглядаць як эксперымент ці рэпетыцыя, то ў другі раз, на этапе ператварэння ў „савецкі народ" адмова ад нацыянальнасці адбывалася б значна лягчэй — ці не праўда, тонкі псіхалагічны ход з мэтай манкуртызацыі насельніцтва. Аднак савецкая ўлада здолела прайсці на Палессі, дзе пражывала найменш нацыянальна свядомае насельніцтва, адно частку шляху ў накірунку да чыстай савецкай саматоеснасці, у ходзе чаго практычна нівеліравалася значная доля ўкраінцаў на гэтай тэрыторыі, чаго не было нават у часы Расійскай Імперыі.

Перакрэсліванне адміністратыўнага дзялення падчас германскай акупацыі Палесся на карысць Райхскамісарыята Украіна пры вяртанні Саветаў практычна не адбілася на выніках аднаўлення мяжы 1939 г., аднак у далейшым узмацніла інспіраванне думкі пра прыналежнасць Берасцейска-Пінскага Палесся да этнічных украінскіх межаў[68]. У той жа час забываецца, што пры адміністратыўным дзяленні акупаваных тэрыторый кіраўніцтва Трэцяга Райха практычна не звяртала ўвагі на этнічны аспект, кіруючыся эканамічнымі фактарамі (што нагадвае сітуацыю Пер-

[65] *„Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі..." Верасень 1939 г. — 1956 г.: дакументы і матэрыялы. У 2 кн.*, кн. 1: *Верасень 1939 г. — 1941 г.*, Мінск 2009, с. 54-59.

[66] Е. Ф. Карский, *Этнографическая карта белорусского племени*, [в:] *Труды Комиссии по изучению племеного состава населения России*, вып. 2, Петроград 1918; *Дыялекталагічны атлас беларускай мовы*, Мінск 1963, карты VII, VIII; L. Ossowski, *Studia slawistyczne*, Wrocław — Warszawa — Kraków 1992, s. 77-93.

[67] А. Мартынов, *Разукраинизация*, „Берестейській край", 1997, 26 квітня — 2 травня.

[68] Гл. паказальны прыклад: А. В. Волк, *Этническая самоидентификация личности в условиях пограничья: микроанализ макропроблемы*, [у:] *Асоба ў гісторыі: гераічнае і трагічнае: Матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. студэнтаў і аспірантаў, 21-22 ліст. 2003 г. У 2 ч.*, ч. 2, Брэст 2004, с. 144-147.

шай сусветнай вайны — гл. вышэй): „такі падзел (...) забяспечваў Райхскамісарыят «Украіна» лесам і дрэваматэрыяламі, а таксама ствараліся ўмовы для выкарыстання сістэмы каналаў Прыпяці і чыгункі Брэст — Гомель”[69]. Да таго ж, па-першае, „после многочисленных указаний со стороны Белорусской (Народной) Самопомощи, а затем и со стороны Белорусской Центральной Рады, эти области были (...) в 1944 г. включены в состав Белоруссии” (у лютым), а па-другое, пры праяўленні ініцыятывы беларускіх і ўкраінскіх нацыяналістычных сілаў арганізаваць антысавецкае паўстанне з мэтаю стварэння незалежных дзяржаў украінскі бок прызнаў факт „несомненного белорусского влияния в Полесье”, а таксама тую акалічнасць, што „весьма значительная часть «полешуков» сама признает себя принадлежащими к белорусам и Белоруссии”[70]. Гэта адзначалася нават прадстаўнікамі Украінскай Паўстанцкай Арміі, калі ішла падрыхтоўка УПА да прыходу чарговых Саветаў: у другой палове 1943 г. вывучалася самаідэнтыфікацыя палескага насельніцтва з мэтай прыцягнення яго на свой бок. (Відавочна, што палескія лясы ды балоты, якія з’яўляліся своеасаблівай крэпасцю для партызанскай барацьбы, не маглі не прывабіць сілы рознага палітычнага накірунку. А для ўкраінскага руху да таго ж і падставы былі: Палессе ўключалася ў склад Райхскамісарыята Украіна, дый правы на гэты рэгіён мелі на той час ужо пэўную дзяржаўніцкую традыцыю. Крыху на поўдзень жа лясістасць і балацістасць была зусім рэдзенькая, неспрыяльная для партызанкі, таму рэзыстанс ледзь не ўсіх ідэйных дактрын магнітам прыцягваўся да непралазнага Палесся.) Так каментавалася сітуацыя ў Давыд-гарадоцкім раёне (сёння на тэрыторыі Столінскага раёна Брэсцкай вобласці): „Населення вважає себе білорусами. За українців мають себе тільки одиниці”. Праўда, прадстаўнікі УПА тут паспрабавалі знайсці вытлумачэнне такой сітуацыі, аднак, думаецца, супярэчачы самім сабе ў логіцы. „До цього спричинилися за німецької окупації ляхи (палякі — А. Т.), ведучи пропаганду, мовляв, якщо залишиться білорусами, приділять їх до Білорусії і будуть платити менші контингенти (тут, па логіцы, — падаткі — А. Т.), бо Україна є багатша і платять більші контингенти”. Аднак якая менавіта карысць з гэтай агітацыі палякам, якія мелі стасоўна пытання пра дзяржаўную прыналежнасць дадзенай тэрыторыі сваё, арыгінальнае меркаванне, не тлумачыцца. Тым больш, што, па словах (і небеспадстаўных) саміх упаўцаў, „щодо большовицьких партизан — то населен-

[69] С. Новікаў, *Асаблівасці ваенна-эканамічнай гісторыі Беларускага Палесся (1941-1944 гг.)*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 2004, № 4, с. 16. Гл. таксама: С. Я. Новікаў, *Гаспадарчыя аспекты ваеннай гісторыі Беларускага Палесся*, [у:] *Беларусь — Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18-19 сакавіка 2003 г.)*, с. 285.

[70] К. Б. Езовитов, *Воспоминания*, „Неман”, 1993, № 3, с. 143, 145.

ня їм активно протиставляється"[71]. Гэта значыць, для жыхароў дадзенага рэгіёна партызаны УПА, для якіх палеская зямля, Валынь былі сапраўды радзімай у адрозненне ад акружэнцаў Чырвонай Арміі і закінутых энкавэдэшнікаў савецкай партызанкі, маглі стаць (і, як даводзіць беларускі даследчык Юры Чарняк, часта станавіліся, асабліва напачатку[72]) адзінымі абаронцамі як ад германскіх акупантаў, так і ад мілітарызаваных лясных атрадаў разнастайнага ангажавання ці палітычнага накірунку, у тым ліку элементарных бандытаў. Да таго ж чалавеку, які знаходзіўся ў пагранічнай сітуацыі, важна было выжыць „тут і зараз", і агітацыя пра выгоды ў эвентуальнай будучыні пры такіх экзістэнцыяльных варунках не ўяўляецца дзейснай. Не было там і ўплыву беларускіх нацыянальных сілаў, так як гэты рэгіён уваходзіў у Райхскамісарыят Украіна, а тыя сілы супрацоўнічалі з германскімі акупантамі і іх спробы аўтанамізавацца нават у Генеральнай акрузе Беларусь аказаліся субтыльнымі і не прынеслі значных вынікаў[73].

У канцы 1944 г., гэта значыць, калі ўсе беларускія і ўкраінскія землі ўжо знаходзіліся пад уладаю бальшавікоў, тэарэтычныя праціўнікі ў рамках „палескай праблемы", якімі з'яўляліся беларускія нацыянальныя сілы, якія калабаравалі з германскімі акупантамі, і ўкраінскія нацыяналістычныя сілы, што змагаліся за незалежную Украіну і супраць савецкай партызанкі, і супраць польскай Арміі Краёвай (а Украінская Паўстанцкая Армія і супраць Вермахта), у сітуацыі здзейсненага факта „маскоўска-бальшавіцкага ярма" і агульных „імкненняў забясьпечыць сваім народам вольнае і незалежнае жыцьцё" былі саюзнікамі ды іхнія стасункі мелі дужа цёплы характар, пра што ў поўнай меры сведчыць навагодняе віншаванне прэзідэнта БЦР Радаслава Астроўскага камандуючаму ОУН „М" (Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў) палкоўніку Андрэю Мельніку з перакананнем стварэння яшчэ больш мацнейшага саюза двух народаў (гл. дадатак № 2)[74]. Увогуле ж трэба адзначыць, што паміж украінскімі і беларускімі нацыя-

[71] *Літопис УПА. Волинь і Полісся: УПА та запілля 1943-1944. Документи і матеріали. Нова серія*, т. 2, Київ — Торонто 1999, с. 247.

[72] Ю. Черняк, *Деятельность украинских националистов на территории БССР в начальный период войны*, „Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы", 2004, № 1, с. 16; Ю. Черняк, *Создание и деятельность Украинской Повстанческой Армии на территории южных районов БССР на завершающем этапе Великой Отечественной войны*, „Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы", 2004, № 4, с. 27.

[73] Гл., напрыклад: J. Turonek, *Białoruś pod okupcją niemiecką*, Warszawa — Wrocław 1989, ss. 186; А. Русниченко, *Народ збурений. Національно-визвольний рух в Україні й національні рухи опору в Білорусії, Литві, Латвії, Естонії у 1940-50-х роках*, Київ 2002, с. 406-416.

[74] Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Беларускай Цэнтральнай Рады Р. Астроўскага военачальніка УПА А. Мельніка 30.12.1944 (копія зроблена з арыгінала),

Прэзыдэнт
Беларускае Цэнтральнае
Рады
№ 298

Бэрлін, дня 30.XII. 1944 г.
Berlin NO 55, Gumbinner Str.28

Высокапаважанаму Спадару
палкоўніку МЕЛЬНІКУ АНДРЭЮ

Б э р л і н.

З нагоды наступаючага 1945 году перасылаю Вам і усяму украінскаму Народу найлепшыя навагоднія пажаданьні.

Няхай новы 1945 год будзе годам канчальнага вызваленьня нашых народаў з пад маскоўска-бальшавіцкага ярма і зьдзейсьненьнем нашых імкненьняў забесьпечыць сваім народам вольнае і незалежнае дзяржаўнае жыцьцё.

Я глыбока перакананы, што украінскі народ створыць у 1945 годзе з беларускім народам, яшчэ больш моцны саюз і гэтым прысьпешыць час канчальнага вызваленьня.

Слава Украіне!

Жыве Беларусь!

З глыбокай пашанай да Вас

налістамі на працягу перыяду германскай акупацыі не толькі не было канфрантацыі, але і больш таго — яшчэ напачатку вайны праводзіліся сумесныя ваенныя акцыі супраць разбітых ды адстаўшых войскаў Чырвонай Арміі (прычым у дадзеным выпадку нават не з ОУН „М" — таксама калабарантамі, а з катэгарычнымі, „шчырымі" незалежнікамі УПА)[75].

Цікава, што, як казалася вышэй, у часы Украінскай Дзяржавы, якую ачольваў гетман Павел Скарападскі, яе дыпламатыя ігнаравала БНР. Украінская Дзяржава была дужэйшай ва ўсіх адносінах, і яе кіраўніцтва праводзіла сваю паўночную мяжу ўключаючы Берасцейска-Пінскае Палессе. Перад абліччам жа агульнай пагрозы з боку бальшавікоў, апынуўшыся практычна ў аднолькавым з беларусамі становішчы, той жа Скарападскі і яго паплечнікі не толькі першымі выразілі пажаданне пайсці на перамовы, а ў далейшым і на саюз з беларусамі, але і лёгка прызналі беларускі кантэкст, прабеларускую тэндэнцыю развіцця разглядаемага намі рэгіёна (гетман у той час ужо не меў дамінуючага ўплыву сярод украінскіх арганізацый і рухаў, аднак, па паведамленні Канстанціна Езавітава, менавіта „из белорусско-украинских встреч со Скоропадским вырос белорусско-украинский союз (...) определены границы Белоруссии и Украины"[76]). Дый сённяшнімі ўкраінскімі гісторыкамі прызнаецца, што „територіальний роздріб (у часы германскай акупацыі 1941-1944 гг. — А. Т.) засвідчив, що гітлерівське керівництво аж ніяк не переймалося етнографичною цілісністю загарбаних країн"[77].

Варта таксама звярнуць увагу на тое, што М. Хрушчоў, які ў 1939 г. прывёз Сталіну праект украінска-беларускай мяжы з уключэннем Берасцейска-Пінскага Палесся ў склад Украіны, пасля смерці „бацькі народаў", у перыяд свайго кіравання, аднак, не рашыўся рэалізаваць свае даўнія намеры, маючы для гэтага, як паказаў прэцэдэнт з перадачай Крыма Украінскай ССР, усю паўнату ўлады, хоць, па ўспамінах П. Панамарэнкі, М. Хрушчоў быў „чалавекам злапамятным, нічога ніколі не забываў"[78], дый на Крым у адрозненне ад адносна спрэчнага Палесся

Архіў ОУН у Києві. Аўтар выражае ўдзячнасць супрацоўніку архіва к. г. н. Ю. А. Чэрчэнку за прадастаўленне магчымасці скапіраваць аўтэнтык з фондаў, якія знаходзяцца на стадыі ўпарадкавання і рэгістрацыі.

[75] Ю. Черняк, *Деятельность украинских националистов на территории БССР в начальный период войны*, „Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы", 2004, № 1, с. 11-17.

[76] К. Б. Езовитов, *Воспоминания*, „Неман", 1993, № 3, с. 147.

[77] Г. Й. Удовенко, *Соборність українських земель в контексті Другої світової війни 1939-1945 рр.*, [у:] *Соборність українських земель в контексті Другої світової війни (Збірник матеріалів загальноукраїнської наукової конференції 24-25 жовтня 2000 р.)*, Кривий Ріг 2000, с. 14.

[78] *Як Сталін землі ділив (Спогад П. Пономаренка)*, „Пам'ятки України: історія та культура", 2002, № 3-4, с. 116.

Украіна не мела, бадай, ніякіх гістарычна ці этнаграфічна абумоўленых падстаў і тым больш правоў (да таго ж варта нагадаць, што Крым быў уключаны ва Украінскую ССР у 1954 г., калі М. Хрушчоў яшчэ нават не быў вярхоўным кіраўніком СССР, якім стаў у 1956 г.). Магчыма, тут сыграла ролю тое, што М. Хрушчоў, будучы прагным прыхільнікам і спадзвіжнікам ператварэння народаў Саюза ў адзіны „савецкі", палічыў такі крок нямэтазгодным, бо перакрэсліванне межаў стала б нагодай для насельніцтва задумацца над сваёй сапраўднай нацыянальнай прыналежнасцю, а прабуджэнне нацыянальнай свядомасці аніякім чынам не ўваходзіла ў планы будаўнікоў камунізму.

І яшчэ цікавы і паказальны момант ужо з самай „свежай" гісторыі. Падчас чарговых выбараў прэзідэнта Рэспублікі Украіна (2000 г.) у Дубровенскім раёне Ровенскай вобласці, які мяжуе з Брэсцкай вобласцю Рэспублікі Беларусь, некаторыя жыхары ў бюлетэнях шукалі кандыдатуру дзейснага тады прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі[79]. Здаецца, каментарыі лішнія.

Досвед развіцця ўкраінска-беларускіх палітычных перыпетый, узаемаадносін кажа пра тое, што, усведамляючы слізкасць „палескай праблемы", ператвараючы яе вырашэнне ў дыпламатычныя гульні, іх суб'екты мелі на мэце перш за ўсё замацаванне сваёй дзяржаўнасці, яе жыццяўстойлівасці наогул, для чаго і запатрабавалася пастаноўка максімалісцкіх задач (што, дарэчы, у 1918-1921 гг. атрымалася ў ІІ Рэчы Паспалітай стасоўна заходніх частак Беларусі і Украіны пры імкненні аднавіць межы 1772 г.). Гэты момант неабходна ўсведамляць навукоўцам і зыходзіць з яго пры даследаванні гісторыі і культуры Палесся.

Такім чынам, глабальныя падзеі, якія распачаліся ў 1939 г., маленькай, але неад'емнай часткай якіх з'явілася правядзенне беларуска-ўкраінскай мяжы ў заходняй яе частцы, відавочна, былі „запраграмаваны" ў ханалагічным адрэзку з 1914 па 1921 гг., апафеозам якога сталі дакументы, падпісаныя ў Версалі, а таксама, што тычыцца разглядаемай праблемы, трохі раней у Брэсце. Карані ж гэтай праблемы ўзыходзяць менавіта да палітычных перыпетый і менавіта тагачасся, але не глыбей, як інтэрпрэтуюць некаторыя даследчыкі, ныраючы ў глыбіню стагоддзяў і/ці карыстаючыся эклектычнай аргументацыяй. Нягледзячы на палітычныя спекуляцыі і гульні, гістарычная прыналежнасць Берасцейшчыны ў XX ст. абазначылася дастаткова акрэслена і ў наш час на гэтай глебе не павінна ўзнікаць прынцыповых рознагалоссяў. Сёння ж калі і існуе „ўкраінскае пытанне" на Берасцейска-Пінскім Палессі, дык гэта не спрэчка пра гістарычную прыналежнасць разглядаемага рэгіёна, а праблема адраджэння ўкраінскай нацыі і яе культуры ў пры-

[79] Зборы аўтара.

межных раёнах Брэсцкай вобласці, бо кампактнае пражыванне ў нядаўнім мінулым на гэтых землях украінцаў (што і нядзіўна для пераходных этнічных тэрыторый) не выклікае сумненняў.


**Streszczenie**

Tematem artykułu jest problem przynależności Polesia Pińsko-Brzeskiego. Autor dochodzi do wniosku, że ma ona korzenie polityczne i skłania się ku poglądowi, że w XX wieku na Polesiu dominował wektor centralizacji probiałoruskiej, nie zważając na kruchość białoruskich sił politycznych. Na ten aspekt zwracają uwagę również polscy analitycy. Natomiast działania polityków ukraińskich wyrażają ich utylitarne zainteresowanie regionem poleskim, które wyraźnie słabnie na korzyść Białorusi w warunkach utraty przez Kijów politycznego znaczenia na arenie międzynarodowej. Jednak autor nie odrzuca istnienia ostrego problemu ukraińskiego w przygranicznych rejonach Ziemi Brzeskiej.



**Summary**

The article deals with the issue of Pinsk-Brest Polesia's state membership. The author draws a conclusion that its roots are political believing that in the 20th century Polesia was dominated by pro-Belarusian centralization vector ignoring fragility of Belarusian political forces. Polish analysts pay attention to this aspect as well. On the other hand, actions undertaken by Ukrainian politicians express their utilitarian interest in Polesia region, which is becoming expressly weaker in favor of Belarus in terms of Kiev losing its political importance in the international arena. Nevertheless, the author does not deny the existence of an acute Ukrainian problem in borderland areas of Brest Land.



**Anatol Trafimczyk** — doktor filozofii w dziedzinie nauk historycznych, starszy pracownik naukowy Państwowego Muzeum Literacko-Memorialnego Jakuba Kołasa w Mińsku. Zajmuje się problematyką oświaty w zachodnich regionach Białorusi, pograniczem zachodniobiałoruskim i historią polityczną I poł. XX w. Autor ponad 80 publikacji naukowych.